Блізкая ўлада

# НЕ ПРОСТА ІНФАРМАЦЫЙНЫ ШУМ

**Як эфектыўна працаваць з людзьмі, абмеркавалі ў Пухавіцкім раёне**



Фота БелТА.

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА ў час рабочай паездкі ў Пухавіцкі раён Мінскай вобласці прыняў удзел у пасяджэнні райвыканкама. Разглядалася пытанне аб выніках работы па выкананні Дырэктывы Прэзідэнта «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва» за першае паўгоддзе.**

«У рабоце са зваротамі грамадзян самае галоўнае — не стаць абыякавымі, як кажуць у народзе, і не зачарсцвець да праблем простага чалавека, таму што праблемы будуць збірацца і збірацца. Я думаю, што гэта самая вялікая небяспека для ўсіх нас», — лічыць Ігар Сергеенка.

Разам з тым, адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, не варта дапускаць і ўтрымантства. «Вырашаючы сур'ёзныя праблемы, мы часам, дзе трэба і не трэба, балуем грамадзян. І з'яўляецца праблема ўтрымантства. Таму трэба вылучаць больш сур'ёзныя праблемы, для вырашэння якіх сапраўды патрэбна дапамога дзяржавы», — падкрэсліў ён.

Ігар Сергеенка звярнуў увагу і на пытанне дэбюракратызацыі. «Не трэба ўсё зводзіць да разгляду зваротаў грамадзян. Дырэктыва № 2 усё ж такі крыху шырэйшая. Калі праблема ёсць, яе трэба агучваць, абмяркоўваць, нешта прапаноўваць для вырашэння», — сказаў на заканчэнне кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ён закрануў і пытанне інфармацыйнай работы з грамадзянамі. «Інфармацыйная работа не павінна быць проста інфармацыйным шумам. Можна стварыць шмат выязных груп, ахапіць шырокія пласты насельніцтва, а ў выніку правесці ўсё гэта фармальна і бяздушна. Калі мы праводзім такія мерапрыемствы, людзі туды павінны ісці з цікавасцю», — падкрэсліў Ігар Сергеенка.

**Паводле БелТА.**

Выбары-2024

# Па новых правілах

**Цэнтрвыбаркам сфарміраваў акругі і ўстанавіў сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання**

**Усяго ў краіне будзе сфарміравана 1284 Саветы дэпутатаў. Сярэдняя колькасць выбаршчыкаў на выбарчую акругу складзе 61 960 чалавек. Як паведаміў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА, аналагічныя рашэнні прыняты на месцах, вызначана таксама колькасць акруг, якія будуць утварацца да выбараў дэпутатаў мясцовых саветаў. «Гэта лічба складзе 12 514 акруг, што на 5,5 тысячы менш у параўнанні з кампаніяй 2018 года, — дадаў ён падчас пасяджэння ЦВК. — Колькасць саветаў зменшылася на 25».**

Пастанова Цэнтрвыбаркама змяшчае падрабязнае апісанне межаў кожнай акругі, а таксама яе найменне, нумар, колькасць выбаршчыкаў і месца знаходжання акруговых выбарчых камісій. Дакумент будзе апублікаваны на афіцыйным сайце Цэнтральнай камісіі — www.rec.gov.by, а таксама ў друкаваных сродках масавай інфармацыі. Праведзена работа па нанясенні межаў выбарчых акруг на публічную кадастравую карту Рэспублікі Беларусь.

## Абноўлены сайт і падарунак для маладых выбаршчыкаў

Ажыццяўляецца поўная мадэрнізацыя сайта Цэнтральнай выбарчай камісіі, адпрацоўваюцца пытанні павышэння яго прапускной магчымасці. «Мы бачым, што на сайты дзяржорганаў нярэдка ідуць знешнія атакі, здольныя непадрыхтаваны сайт «пакласці», — патлумачыў Ігар Карпенка прычыну гэтай работы. — Цудоўна разумеем, што ўсе месенджары, якія ў нас ёсць у сацыяльных сетках, могуць быць адключаныя, заблакіраваныя для нас і г. д. Таму будзем арыентавацца усіх на тое, што першая і самая дакладная інфармацыя Цэнтральнай выбарчай камісіі будзе размяшчацца на сайце ЦВК».

Маладым выбаршчыкам, якія ўпершыню прыйдуць на выбарчыя ўчасткі ў адзіны дзень галасавання, будуць уручаны падарункавыя выданні Канстытуцыі. Такое рашэнне было прынята на пасяджэнні ЦВК. Усяго будзе выпушчана каля 180 тысяч падарункавых выданняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь на рускай і беларускай мовах. Маладым людзям, якія ўпершыню прагаласуюць на выбарчых участках, падарункавае выданне ўручаць як у адзіны дзень галасавання, так і ў перыяд датэрміновага галасавання. Як удакладнілі ў ЦВК, да тых, хто галасуе ўпершыню, будуць адносіцца грамадзяне, якія дасягнулі ўзросту 18 гадоў у перыяд з 28 лютага 2022 года да 25 лютага 2024 года ўключна.

## Выбарчыя ўчасткі за мяжой фарміравацца не будуць

У размове з журналістамі старшыня ЦВК Ігар Карпенка расказаў аб запрашэнні замежных наглядальнікаў на адзіны дзень галасавання. «Гэтае пытанне прапрацоўваецца тымі суб'ектамі, хто можа запрашаць замежных назіральнікаў, — адзначыў ён. — Акрамя ЦВК, такім правам валодаюць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, абедзве палаты парламента, Савет Міністраў і МЗС. Але пакуль казаць аб запрашэнні, прынамсі афіцыйным, рана, бо трэба дачакацца выхаду ўказа кіраўніка дзяржавы ў сярэдзіне лістапада, які акрэсліць пачатак выбарчай кампаніі. З моманту з'яўлення ўказа пачнецца вылучэнне ў склады камісій — тэрытарыяльных, акруговых, участковых. Пачнецца збор подпісаў, рэгістрацыя груп, вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты». Ігар Карпенка расказаў, што на пасяджэнні Кансультатыўнага савета, які праходзіў ва Узбекістане ў перыяд прэзідэнцкіх выбараў у гэтай краіне, ён запрасіў сваіх калег — старшыняў ЦВК краін СНД, якія ўваходзяць у Кансультатыўны савет выбарчых органаў краін СНД, — прыехаць і прыняць удзел у назіранні за адзіным днём галасавання.

Па меркаванні старшыні Цэнтрвыбаркама, рашэнне аб тым, што на выбарах не будуць фарміравацца выбарчыя ўчасткі за мяжой, не ўшчамляе правы грамадзян. Той, хто выехаў за мяжу па тых ці іншых прычынах, зможа прыехаць у Беларусь, прыйсці на ўчастак і прагаласаваць або ў перыяд датэрмінóвага галасавання з аўторка да суботы, або ў адзіны дзень галасавання — 25 лютага 2024 года.

Ігар Карпенка ўдакладніў: для таго каб прагаласаваць, патрэбны дакумент, які пацвярджае асобу. «Такім з'яўляецца пашпарт, але ЦВК традыцыйна прымае рашэнне аб тым, якія яшчэ дакументы могуць сведчыць асобу грамадзяніна, — заўважыў ён. — У выпадках, калі пашпарт, дапусцім, знаходзіцца на афармленні, пададзены на атрыманне візы і г. д. Да такіх дакументаў мы, як правіла, адносілі вадзіцельскае пасведчанне, пенсіённае пасведчанне, студэнцкі білет і іншыя. Гэта чыста працэдурныя пытанні».

**Паводле БелТА.**

На свае вочы

# «ГЭТА НАЙЛЕПШЫ ПАДАРУНАК»

**Сімвал Незалежнасці зноў адчыніў свае дзверы для гасцей**

**110 інспектараў і спецыялістаў Мінскай рэгіянальнай мытні і 115 заслужаных работнікаў сістэмы Мінлясгаса з усіх куткоў Беларусі ўчора з экскурсіяй наведалі Палац Незалежнасці. Такія экскурсіі сталі ўжо добрай традыцыяй. Яны заўсёды праходзяць у цёплай атмасферы, і эмоцыі проста зашкальваюць ад убачанага і пачутага тут.**



**Вядучы спецыяліст па вучэбнай частцы цэнтра павышэння кваліфікацыі работнікаў лясной гаспадаркі Алена ПАЎКОЛАС** з аграгарадка Ляхновічы ў Палацы Незалежнасці сустрэла свой дзень нараджэння: «Я марыла трапіць сюды ўжо вельмі даўно. Рада, што такая ўрачыстая і хвалюючая падзея адбылася менавіта ў гэты дзень. Тут, як і належыць сапраўднаму палацу, вельмі прыгожа і парадна! Уражанні і эмоцыі проста зашкальваюць. У першую чаргу абавязкова распавяду пра палац сваёй сям'і, сябрам, блізкім і ў сацыяльных сетках абавязкова падзялюся».

Суразмоўца прызнаецца, што наведаць Палац Незалежнасці ў такі знакавы для яе дзень не чакала. Па яе словах, такая магчымасць — найлепшы падарунак.

Традыцыйна экскурсія пачынаецца з самай вялікай залы ўрачыстых цырымоній, дзе праходзяць мноства важных мерапрыемстваў. Пераходзячы з залы ў залу, наведвальнікі не стамляюцца захапляцца дзівосным убраннем. Усё гэта дзякуючы таленту нашых суайчыннікаў. Пышныя люстры, эксклюзіўная мэбля, карціны, мазаіка з паркету і мноства выдатных дэталяў ствараюць асаблівую атмасферу ў кожнай зале. Дарэчы, усяго ў палацы 20 асноўных залаў, дзе праходзяць найважнейшыя мерапрыемствы.

**Памочнік ляснічага Наваградскага лясніцтва Святлана ШОРАХ** і **ляснічы Наваградскага лясніцтва Дзмітрый ШЫНТАР** пяць дзён таму звязалі свае жыцці законным шлюбам. Як адзначаюць маладыя, наведаць Палац Незалежнасці — шыкоўны падарунак: «Мы марылі сюды прыехаць, бо чулі пра маштабы і прыгажосць Палаца Незалежнасці. Нам выпаў вялікі гонар трапіць сюды, і мы з радасцю паехалі. Тут вельмі прыгожа. Лічым, што кожнаму трэба тут пабываць. Адчуваецца нацыянальны гонар за Радзіму, а нацыянальная сімволіка зачароўвае.

Палац Незалежнасці сапраўды стаў месцам гонару беларусаў. Яго пабудавалі за 30 месяцаў замест 58 запланаваных, і ён на 90 % выкананы беларускімі майстрамі з айчынных матэрыялаў. Што характэрна, у афармленні багата выкарыстоўваецца нацыянальны арнамент — у мастацкім росписе сцен, столяў, у мазаіцы і метале. Першых высокіх гасцей палац прыняў у кастрычніку 2013 года, амаль 10 гадоў таму.

**Станочнік дрэваапрацоўчага цэха Расонскага лясгаса Віктар КАМКОЎ** адпрацаваў у родным лясгасе 35 гадоў. Ён таксама падзяліўся ўражаннямі: «Для мяне наведванне Палаца Незалежнасці стала нечаканасцю. Першыя ўражанні яркія. Вельмі рады, што мне выпаў такі гонар. Прыгажосць, маштаб, архітэктура — я ніколі такога яшчэ не бачыў».

Не скупіцца на эмоцыі і наступны суразмоўца, **ляснік Чэрыкаўскага лясгаса Васіль ПСЕЎКІН**: «У лясной гаспадарцы працую ўжо 33 гады. На мінулым тыдні, у Дзень работнікаў лясной гаспадаркі, наведаў Мінск і атрымаў узнагароду ад міністра. А ўжо сёння я ў Палацы Незалежнасці! Ніколі раней тут не быў, і вось мне пашанцавала ўбачыць на свае вочы. Вельмі прыгожа. Усе пакоі і залы, якія мы паглядзелі, захапляюць. Лічу, што абсалютна кожнаму варта тут пабываць».

Безумоўна, наведванне Палаца Незалежнасці застанецца незабыўнай падзеяй, якая падарыла магчымасць яшчэ раз адчуць гонар за родную Беларусь, за сваіх таленавітых суайчыннікаў.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ІТ-кампаніі звольнілі звыш 236 тысяч супрацоўнікаў

Звыш 236 тысяч работнікаў тэхналагічнай сферы ў свеце пазбавіліся работы з пачатку гэтага года, паказвае даследаванне партала Layoffs.fyi. Даныя сведчаць аб тым, што колькасць скарачэнняў у тэхсектары сёлета значна перавысіць паказчык за мінулы год. Летась кампаніі звольнілі 154,3 тысячы супрацоўнікаў, паведамляе Layoffs.fyi. На мінулым тыдні вытворца тэлекамунікацыйнага абсталявання Cisco Systems Inc. анансаваў звальненне 350 супрацоўнікаў, а ў пачатку верасня аб скарачэнні штата на 10 працэнтаў абвясціла стрымінгавая кампанія Roku Inc. Яе штат на канец мінулага года налічваў каля 3,6 тысячы чалавек. Сярод тэхкампаній, якія абвясцілі аб звальненнях у гэтым годзе, — амерыканскія Amazon.com Inc., Electronic Arts, Palantir Technologies, Twilio Inc., DocuSign Inc., Salesforce Inc., Zoom Video Communications, eBay, Dell Technologies, PayPal Holdings, International Business Machines, Intel Corp., Microsoft Corp., Alphabet Inc., а таксама нямецкая SAP і шведская Spotify Technology.

## Колькасць загінулых і пацярпелых пры пажары на вяселлі ў Іраку перавысіла 450 чалавек

Пра гэта паведаміла мясцовая арганізацыя Чырвонага Паўмесяца ў сацсетках. Жудасны інцыдэнт адбыўся ў зале вясельных урачыстасцяў у горадзе Бахдыда (таксама вядомым як Эль-Хамданія або Каракош), што ў правінцыі Найнава. З'явіліся кадры ўзгарання і яго наступстваў. Відаць, што цалкам выгарэла зала, дзе праходзіла вяселле, абрынуліся сцены і дах, а ад мэблі застаўся толькі каркас. Паводле папярэдніх даных, прычынай узгарання стала выкарыстанне феерверку ў закрытым памяшканні. Па інфармацыі ўпраўлення грамадзянскай абароны, урачыстая зала была абсталявана лёгкаўзгаральнымі панэлямі, што парушала правілы тэхнікі бяспекі. Таксама былі выяўлены парушэнні ў сістэмах сігналізацыі і тушэння пажараў, якія не адпавядаюць стандартам бяспекі.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста ў сувязі з пажарам у горадзе Эль-Хамданія накіраваў спачуванне Прэзідэнту Ірака Абдуле Латыфу Рашыду.**